Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 13 СТУДЗЕНЯ 1977 г.

№ 2 (1152)

Цана 2 кап.

## ПУЛЬС СЕСІІ

Чацвёртакурснікі хімічнага факультэта (група паўправаднікоў) паспяхова здалі першы экзамен. Выкладчык У. Лішнеўскі застаўся задаволен адказамі па фізічнай хіміі выдатнікаў вучобы Г. Ажар, П. Жука.

**Добры пачатак і ў студэнтаў ІІ курса 5-й групы біялагічнага факультэта. З 26 чалавек 14 здалі экзамен па вышэйшай матэматыцы на «выдатна». Сярод лепшых — студэнты С. Гілевіч, І. Бяспалаў, А. Мірашнічэнка, А. Фамічоў.**

**Іх калегі — студэнты 1-й групы — парадавалі станоўчымі адказамі па гісторыі КПСС. Дацэнт А. Царук адзначыў адказы І. Мінчэні, А. Долбік, А. Несцеравай, І. Пянькоўскай.**

Поспех спадарожнічае і першакурснікам фізічнага факультэта. А. Ржэўскі, Г. Стараверава і многія іншыя прайшлі першыя выпрабаванні, з гонарам абараніўшы званне студэнта.

Добра адзываецца дэканат фізічнага факультэта і аб замежных студэнтах з ГДР і ЧССР, якія навучаюцца ў нас. Граф Андрыас, Шэбе Хендрык, Кашнар Армін, Мірaслаў Потак, Яраслаў Галомек, Самуел Масар свой першы экзамен вытрымалі на «выдатна».

**Сакрэт паспяховых адказаў на экзаменах—упартая праца над падручнікам плюс рэгулярнае наведванне лекцый. Іменна так растлумачыла адзнаку «выдатна», атрыманую на экзамене па фізіялогіі раслін, чацвёртакурсніца біялагічнага факультэта Людміла Дарашэвіч.**

Л. ЖЫЛІНСКАЯ, А. ЯКУБОЎСКАЯ.

# РАБОТА НАША ТАКАЯ

**Грамадская работа. У чым сакрэт яе прыцягальнай сілы для многіх з нас, хто, раз і назаўсёды праявіўшы у ёй актыўны ўдзел, застаецца верным ёй на працягу ўсяго жыцця! У кожным калектыве, вялікім або малым, мы заўсёды знаходзім людзей, работу або вучобу якіх не ўяўляем па-за грамадскай дзейнасцю. Гэта нашы актывісты, людзі, чый энтузіязм, натхнёны арганізатарскі парыў, аптымізм з'яўляюцца іх найлепшым самавыражэннем.**

**Некаторыя з надзённых пытанняў грамадскай работы, закранутыя ў гутарцы нашага карэспандэнта Н. Лебедзевай з членам парткома універсітэта, студэнтам ІІІ курса юрфака Анатолем Пятровым, мы прадстаўляем сёння ўвазе нашых чытачоў.**




**КАРЭСПАНДЭНТ:**

— Вялікая адказнасць, ускладзеная на камуніста з выбраннем яго ў члены парткома універсітэта, як правіла, патрабуе не толькі наяўнасці неабходных навыкаў арганізатарскай работы, але і пэўнай маральна-палітычнай падрыхтоўкі асобы. Для студэнта, якому аказана высокае давер'е камуністаў, гэта перш за ўсё азначае фарміраванне ў яго актыўнай жыццёвай пазіцыі, добрасумленных адносін да грамадскага доўгу, гэта значыць, усіх тых якасцей, якія ўзвышаюць асобу ідэйна і маральна. У гэтым ключы мне і хацелася павесці нашу сённяшнюю гаворку. Калі ласка, Анатолій.

**А. ПЯТРОЎ:**

— Аб неабходнасці мець высокі ідэйна-тэарэтычны ўзровень у аснове грамадска-палітычнай падрыхтоўкі гаварыць не даводзіцца. Гэта — аснова палітыка-выхаваўчай работы, якой у фарміраванні камуністычнага светапогляду належыць рашаючая роля. У гэтым плане цяжка пераацаніць значэнне сур'ёзнага, пастаяннага вывучэння ленінскай тэарэтычнай спадчыны.

Мне, у прыватнасці, у сувязі з выбраннем у члены парткома прыйшлося не толькі павышаць узровень ведаў па марксісцка-ленінскай тэорыі, але і грунтоўна вывучаць устаўныя патрабаванні, глыбей унікаць і засвойваць вучэбна-праграмны матэрыял. Сёння ва ўсякай грамадскай рабоце, у любой дзейнасці нельга зрабіць колькі-небудзь паспяховага кроку наперад без ведання матэрыялаў XXV з'езда партыі. Адсюль і наша задача: вывучаць і выкарыстоўваць у сваёй рабоце рашэнні партыйнага з'езда. А сама актыўная жыццёвая пазіцыя, я лічу, фарміруецца ў студэнта на працягу ўсяго навучання ў ВНУ, таксама, як фарміруецца яго грамадзянская самасвядомасць і ідзе падрыхтоўка да самастойнага жыцця.

**КАРЭСПАНДЭНТ:**

— У выступленні кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэрава на Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах камуністычнага выхавання моладзі гаварылася аб тым, што цяпер у ВНУ акцэнт у падрыхтоўцы будучага спецыяліста робіцца на тым, каб «будучы спецыяліст мог свабодна і самастойна арыентавацца ў нарастаючым патоку навуковай і палітычнай інфармацыі, пастаянна папаўняць свой інтэлектуальны багаж». У якой меры грамадская работа дапамагае стаць на ўзровень гэтых сучасных патрабаванняў?

**А. ПЯТРОЎ:**

— Сапраўды, стала ўжо неабходнасцю, што сённяшні выпускнік ВНУ павінен валодаць не толькі прафесійнымі ведамі, але быць і палітычна эрудзіраваным спецыялістам. І той студэнт, які на працягу пяці год актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці групы, курса, факультэта або універсітэта, атрымаўшы дыплом, напэўна, будзе адпавядаць гэтым патрабаванням. Бо грамадская работа — лепшая школа зносін, важнейшы шлях станаўлення асобы.

Зараз у нас — маса магчымасцей папоўніць свой інтэлектуальны багаж, развіць асабістыя здольнасці. Тут усё залежыць ад кожнага канкрэтнага чалавека. Залежыць так, як і тое, наколькі цікавым і захапляючым будзе жыццё ў групе і на курсе, якую карысць прынясуць праведзеныя мерапрыемствы — словам, уся дзейнасць грамадскай работы.

**КАРЭСПАНДЭНТ:**

— Многія вельмі абстрактна, у якойсьці меры адцягнена ад жыццёвай рэальнасці глядзяць на праблему пастаянных і часовых даручэнняў. Некаторыя лічаць, што чым вышэй тая грамадская інстанцыя, у якой выконваецца даручэнне, тым вышэй і максімум магчымага ўкладу ў грамадскую работу. Ці існуе тут праблема наогул і якая ўзаемасувязь упамянутых мной аспектаў у самой арганізацыі грамадскіх даручэнняў? Зыходзячы з асабістага вопыту работы...

**А. ПЯТРОЎ:**

— Думаю, што як аб праблеме тут гаварыць не трэба. Бо гаворка ідзе аб адносінах да выканання грамадскіх даручэнняў наогул, што ж датычыцца камуністаў, то, па майму перакананню, кожнае даручэнне, пастаяннае ці часовае, больш ці менш адказнае, яно павінна выконвацца ім з усёй аддачай. І не трэба прымяншаць значнасць тых даручэнняў, якія даюцца, напрыклад, у партгрупах. Абсалютна няправільна, калі эфектыўнасць выконваемай грамадскай работы ставіцца ў залежнасць ад таго, у якім звяне арганізацыі — ніжэйшым ці вышэйшым — выконваецца даручэнне. Памятаю, з якім энтузіязмам я праводзіў работу ў групе, а потым на курсе ў якасці партгрупорга. Працаваў —на сумленнасць. І вось у мінулым годзе быў выбран у партком універсітэта.

**КАРЭСПАНДЭНТ:**

— Анатолій, твая будучая прафесія — юрыст. Як ты ацэньваеш ролю той грамадска-палітычнай практыкі, якую ты праходзіш у працэсе вучобы, у авалоданні сваёй будучай прафесіяй?

**А. ПЯТРОЎ:**

— У перспектыве, як будучаму работніку дзяржаўнага апарату, мне прадстаіць весці вялікую работу па прапагандзе асноў камуністычнай маралі і савецкага права, пераконваць і разуп... раіць і караць, адным словам, — выхоўваць. Згадзіцеся, што для гэтага патрэбны вялікія практычныя навыкі, якія і набываюцца ў працэсе праходжання грамадска-палітычнай практыкі. І яшчэ, пры распрацоўцы тэм для выступленняў глыбей вывучаюцца самыя розныя пытанні, якія датычацца маёй прафесіянальнай падрыхтоўкі, што таксама немалаважна.

**КАРЭСПАНДЭНТ:**

— Дагэтуль гаворка ішла аб дзейнасці грамадскай. Але ўсё ж галоўнае, святая святых студэнта — гэта вучоба. І як у нас прынята лічыць (а гэта так і ёсць), добры той грамадскі дзеяч, які ў якімсьці вельмі асобным момакце можа ўдала спалучаць і добрую вучобу, і грамадскую работу. Як гэта ўдаецца табе?

**А. ПЯТРОЎ:**

— Праблема часу была і застаецца. Але наколькі ўдала часам спланууеш свой рабочы дзень, настолькі і рошыш гэту праблему для сябе асобна. Многае, канешне, залежыць і ад умення рабіць усё дакладна і аператыўна. А ў астатнім патрабуецца пастаяннае імкненне: ісці ў нагу з часам.

## ХВІЛІНЫ ХВАЛЮЮЧЫЯ І ШЧАСЛІВЫЯ

На вуліцы сыпле снег. Бялюткай цыноўкай ён засцілае ўсё навокал, падае за каўнер. Яшчэ не развіднела...

Я прыходжу на філфак, калі толькі-толькі пачынаюць збірацца студэнты. Хто ўлятае, як метэор, хуценька распранаецца, мімаходзь зірне ў люстра і—наверх; хто наадварот: распранаецца марудна, валасы то прыгладзіць, то распушыць, то хвосцікі зробіць, то абцікам закруціць. Ну, цяпер, здаецца, можна ісці.

...Я сяджу ў аудыторыі нумар чатыры. Тут здаюць свой першы ў нашым універсітэце экзамен трэцякурснікі, студэнты-стажоры з ГДР.

Пакуль першая «пяцёрка» збіраецца з думкамі, рыхтуючыся да адказу, хачу прывесці словы дэкана А. Волка пра старэйшых выкладчыкаў факультэта З. Коласаву, А. Куцэнка і Л. Халімановіч, якія зараз прымаюць экзамен па практыцы вуснай і пісьмовай рускай мовы:

— Выкладчыкі маюць вялікі стаж работы. Яны імкнуцца арганізаваць сваю працу так, каб не толькі навучыць замежных студэнтаў рускай мове, але і пазнаёміць іх з жыццём савецкага народа, з культурным багаццем нашай рэспублікі.

Я аддалася ўспамінам і не заўважыла, што адказ Ангелікі Бойстэр падыходзіць к канцу. «Добра», — гаворыць выкладчыкі, і Ангеліка, радасная, пакідае аўдыторыю.

— Калі ласка, заходзьце!

Утэ Кугель смела ўвайшла, усміхнулася, нібыта не на экзамене, а на звычайнай лекцыі. Паўгадзіны назад, калі я спыталася, ці страшна, Утэ падзіцячаму заварожана прашаптала: «Страшна!». Мо за усмешкай яе хаваецца хваляванне? А мо яно зусім знікла? Так бывае ў самую адказную хвіліну — трапятанне кудысьці знікае, на сэрцы становіцца спакойна-спакойна.

Утэ пайшла рыхтавацца, а Рэгіна Зухер — адказваць.

— Чаму апавяданне, аб якім вы вядзеце гаворку, называецца «Строгі настаўнік?»

— У школе заўсёды так—калі настаўнік хоча, каб яго любілі вучні, быў харошым чалавекам, то патрабавальна ставіцца да яго.

— А цяпер, Рэгіна, знайдзіце памылку ў сказе «Ён не хацеў, што вучань загінуў».

Рэгіна адказвае на другое пытанне білета, а я тым часам гляджу на Утэ. Схіліўшыся над кніжкай, яна водзіць па старонках пальцам, штосьці запісвае... Белыя пасмы валасоў спадаюць на твар. Не адрываючыся ад работы, яна адкідвае іх кіўком галавы.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# У ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНАЙ СЯМ'І

УГЭТЫМ навучальным годзе споўнілася 30 год з пачатку падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй для сацыялістычных краін у навучальных установах СССР.

Белдзяржуніверсітэт таксама святкуе своеасаблівы юбілей — прайшло 15 год з таго часу, як першыя прадстаўнікі рэспублікі Куба ўліліся ў шматнацыянальную сям'ю нашых студэнтаў. Гэта былі першыя замежныя студэнты ў нашай рэспубліцы. Сёння ў БДУ авалодваюць ведамі 536 студэнтаў, аспірантаў і стажораў з 50 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі.

Жывуць замежныя студэнты ў нашым універсітэце, як і ва ўсіх ВНУ краіны, у адных інтэрнатах з савецкімі студэнтамі, вучацца ў адных і тых жа аўдыторыях, кабінетах, лабараторыях, па адных і тых жа праграмах, падручніках.

Адносіны дружбы, таварыскасці, узаемадапамогі паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў Белдзяржуніверсітэце, — яшчэ адно сведчанне інтэрнацыяналізму. Для паспяховай вучобы ў нашым універсітэце ёсць усе ўмовы. Для чытання лекцый, правядзення практычных і семінарскіх заняткаў прыцягваюцца найбольш падрыхтаваныя, з вялікім вопытам работы выкладчыкі.

Да паслуг замежных студэнтаў — лабараторыі, бібліятэкі, чытальныя залы, лінгафонныя кабінеты. Толькі бібліятэка падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян мае звыш 30 тысяч кніг грамадска-палітычнай, вучэбна-метадычнай і мастацкай літаратуры на рускай, англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай, в'етнамскай і арабскай мовах.

Усё гэта, а таксама вялікая працавітасць навучэнцаў, абумовіла той факт, што абсалютная большасць замежных студэнтаў вучыцца на добра і выдатна. Добра знаёмы ў БДУ імёны выдатнікаў Хорхе Луіса Арочы Перэс (Куба), Цэрка Райнера (ГДР), Смужовай Іржыны (ЧССР), Фан Тхе Лонга (СРВ), Фам Нью Ань (СРВ) і іншых.

Вельмі актыўнымі былі студэнты з замежных краін у перыяд падрыхтоўкі універсітэцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 30-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яны падрыхтавалі і абмеркавалі звыш 100 рэфератаў і дакладаў. 18 лепшых выступленняў прагучалі на канферэнцыі БДУ. Студэнт з ЧССР Ян Маловец з дакладам «Удзел грамадзян замежных краін у партызанскай барацьбе ў Беларусі» і аспірант з Судана Самір Шахін з дакладам «Значэнне перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне для развіцця нацыянальна-вызваленчага руху» прадстаўлялі наш універсітэт на Усесаюзнай інтэрнацыянальнай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 30-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Іх даклады атрымалі высокую ацэнку журы і былі адзначаны дыпломамі першай ступені.

З замежнымі студэнтамі праводзіцца таксама вялікая выхаваўчая работа. Студэнты знаёмяцца з дасягненнямі савецкіх людзей у галіне народнай гаспадаркі, у навуцы, культуры. Арганізуюцца экскурсіі на прамысловыя прадпрыемствы, у саўгасы, калгасы. Штогод замежныя студэнты наведваюць месцы рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Адэсе.

Вось што напісала студэнтка-стажор з ГДР Таццяна Міш пасля наведання мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»: «Я — немка, і, паверце, вельмі хвалявалася перад экскурсіяй. Мне хочацца, каб усе мае суайчыннікі наведалі гэта свяшчэннае месца».

За апошнія гады ў нашым універсітэце ў падрыхтоўцы спецыялістаў для замежных краін намеціліся зрухі ў бок пераемнасці. Замежныя студэнты-выпускнікі БДУ, якія добра зарэкамендавалі сябе ў рабоце студэнцкага навуковага таварыства, якія маюць схільнасці і здольнасці да навуковых даследаванняў і выкладчыцкай дзейнасці, застаюцца ва універсітэце або ў хуткім часе прыязджаюць для працягвання вучобы ў аспірантуры. Напрыклад, Іаханес Круша (ГДР), які скончыў у мінулым годзе фізфак БДУ з адзнакай, зараз паспяхова вучыцца ў аспірантуры. Пасля заканчэння нашага універсітэта працягваюць вучыцца ў аспірантуры Іса Давары (Афганістан), Мажэд Алі Махамед (Ліван), Таццяна Міш (ГДР), Чан Дык Ван (СРВ) і іншыя.

У вольны ад вучобы час замежныя студэнты займаюцца ў спартыўных секцыях, удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці. Па ініцыятыве гарадскога савета па справах замежных навучэнцаў і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР у Мінску штогод праходзяць агляды-конкурсы мастацкай творчасці замежных навучэнцаў, праводзяцца спартакіяды. Замежныя студэнты універсітэта дастойна прадстаўляюць нашу ВНУ ў гэтых мерапрыемствах.

Школай жыцця стаў трэці працоўны семестр і для замежных студэнтаў. Добра зарэкамендавалі сябе байцы інтэрнацыянальнага атрада імя героя Савецкага Саюза Фрыца Шменкеля — студэнты з ГДР і СССР — на ўборцы ўраджаю ў Малдавіі.

Прыемна адзначыць, што падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян БДУ за 15 год інтэнсіўнай работы падрыхтаваў для паступлення ў ВНУ і тэхнікумы Савецкага Саюза звыш 2000 замежных грамадзян. Фізічны, механіка-матэматычны, філалагічны, хімічны, біялагічны факультэты і ФПМ выпусцілі звыш 300 кваліфікаваных спецыялістаў для сацыялістычных і развіваючыхся краін. 30 прадстаўнікоў ГДР, МНР, ПНР і іншых краін скончылі аспірантуру і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі, звыш 150 прайшлі навуковую стажыроўку на розных кафедрах БДУ.

Замежныя студэнты і аспіранты — выпускнікі Белдзяржуніверсітэта паспяхова працуюць у сябе на радзіме, многія з'яўляюцца вядомымі дзеячамі навукі і тэхнікі, народнай адукацыі, культуры. Гэта Базілій Чэчуга (ПНР) — доктар біялагічных навук, загадчык кафедры Варшаўскага універсітэта, Хоан Дзінь Зунг (СРВ) — загадчык аддзела ў камітэце па навуцы СРВ, Фам Ван Дэу (СРВ) — рэктар педінстытута ў горадзе Ханоі, Арланда Рэйноса Эспіноса (Куба) — намеснік дырэктара інстытута хіміі Акадэміі навук Рэспублікі Куба, Галамін Сээгійн Шылагардзі (МНР) — загадчык кафедры паўправаднікоў ва універсітэце горада Улан-Батар і многія іншыя.

**І. ЧЭПА,**
**прарэктар па рабоце з замежнымі навучэнцамі і замежных сувязях БДУ.**

## У АБ'ЕКТЫВЕ—БІЯФАК



**Кафедра агульнай экалогіі зусім нядаўна створана на біялагічным факультэце. Але тут, як і на іншых кафедрах, рашаюцца важныя праблемы народнай гаспадаркі рэспублікі.**

**Пасільны ўдзел у навуковых даследаваннях прымаюць і студэнты.**

**Мы зазірнулі ў адну з аудыторый біяфака на семінар па воднай мікрабіялогіі. Будучы гідрабіёлаг Наталля Саковіч сказала:**

**— Сёння вывучаем пробы вады з Вілейскага вадасховішча. Па выніках разлікаў будзе вызначана кармавая база рыб, узровень забруджанасці вады. Гэта вельмі карысная справа.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнтка IV курса Наталля Саковіч ля палярызацыйнага мікраскопа.**



**Студэнты-чацвёртакурснікі кафедры сістэматыкі раслін Валянціна Храпіцкая і Міхаіл Матыль вывучаюць будову раслін, іх асаблівасці.**

**Наперадзе ў сістэматыкаў цікавая і карысная праца: вывядзенне новых сартоў, вывучэнне розных спадчынных захворванняў у раслін.**

**Але ўсё гэта — наперадзе. А пакуль што ўсе намаганні — на выдатную вучобу, на лепшае засваенне патрэбных дысцыплін, на паспяховую здачу сесіі.**

**У. ПАЎЛАЎ,**
Фота **А. Басава.**

## ПУЛЬС СЕСІІ

# ХВІЛІНЫ ХВАЛЮЮЧЫЯ І ШЧАСЛІВЫЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

А вось і апошняе пытанне Зухер. Што табе папалася, Рэгіна? «Характарыстыка чалавека» — сапраўды цяжка. Але...

— Я хачу даць характарыстыку сваёй маці, — вырашае дзяўчына. — Я вельмі люблю яе, у маці залатыя рукі і залатое сэрца. Яна заўсёды ўраўнаважаная, таварыская, у вольны час любіць чытаць, асабліва гістарычныя раманы...

Як гэта цудоўна, думаю я, што ва ўсе часы, ва ўсіх народаў для кожнага чалавека маці застаецца сімвалам пяшчоты, вернасці і дабраты.

— Малайчына, — гэта Аляксандра Віктараўна Куцэнка пра Рэгіну. У залікоўцы — адзнака «добра».

І вось мы за дзвярыма экзамена. Цікава, чым збіраецца займацца Рэгіна зараз?

— Трэба крышачку адпачыць. А пасля... Сёння — маленькае свята. У адной з нашых сябровак — дзень нараджэння.

Мы доўга гутарым з Рэгінай. Пра яе савецкіх сяброў, пра інтэрнат, пра знаёмствы з гарадамі-героямі Ленінградам, Масквой і, канешне, пра канікулы, да якіх засталіся лічаныя дні.

Зноў вяртаюся ў аўдыторыю. Вераніка Клопштэг расказвае сюжэт мастацкага фільма «І ўсё-такі я веру»:

— Гэты фільм мне надта спадабаўся. Цікава паказана жыццё моладзі ў капіталістычных краінах, крызісы, як яны ўздзейнічаюць на моладзь. Многія з маладых людзей Захаду страцілі надзею ў жыццё, не жывуць — існуюць.

...Утэ сядзіць за апошнім сталом. Ловіць мой позірк, усміхаецца, ківае галавой. Цікава, які білет ёй дастаўся? Ці не трынаццаты?..

— Мне здаецца, аўтар фільма хацеў сказаць, што людзі павінны аб'ядноўвацца для барацьбы за мір, прагрэс, светлую будучыню. Ром аптыміст і верыць у чалавека.

Веранікі Клопштэг не задаюць пытанняў: адказ быў сур'ёзны, грунтоўны, глыбокі.

А вось і Утэ садзіцца за першы стол, каб атрымаць ацэнку сваёй працы. Не спяшаючыся, яна вядзе пераказ апавядання «Гаворачае пісьмо».

— Галоўны герой — хлопчык Віця. Яго бацька загінуў у дзень, калі Віця нарадзіўся. Ад бацькі засталося толькі некалькі рэчаў і «гаворачае» пісьмо. Віця многа разоў слухаў гэту пласцінку. Але аднойчы ён перакуліў клей, і на дыску паявіліся плямы...

Пакінем дзяўчыну ненадоўга адзін на адзін з выкладчыкамі і зазірнем у яе біяграфію. 9 верасня мінулага года тут, у Мінску, Утэ стала камуністам. Яна сакратар маладзёжнай арганізацыі, часта бывае ў школах Беларусі, расказвае пра ГДР. Вучоба і грамадская дзейнасць — гэта не ўсё, чым запоўнена жыццё Утэ. Разам з сяброўкамі яна неаднаразова пабывала ў оперным тэатры, філармоніі. Аказваецца, любімы яе паэт — А. С. Пушкін, любімы твор — «Яўгеній Анегін», асаблівыя пачуцці выклікаюць пушкінскія вершы. А калі гаварыць больш, то любоў да рускай мовы і літаратуры прыйшла да яе яшчэ ў школе. З замежных моў Утэ вывучала англійскую, але марыла аб тым, каб стаць выкладчыкам рускай мовы. Мара прывяла Утэ ў Берлінскі універсітэт, а праз два гады — сюды, у Мінск.

Я не сумнявалася ў добрай адзнацы Кугель на сённяшнім экзамене.

— Ведаеш, — сказала яна пасля выпрабавання, — лягла адпачываць, а заснуць не магла да трох гадзін ночы — перажывала.

Апошняй адказвала Урсула Штэгеман. Выкладчыкі без ваганняў паставілі ёй «выдатна». Вось гэта ўдача — першы экзамен і першая пяцёрка! Урсула падхапілася, быццам за спіной у яе былі крылы, не выйшла — вылецела з аудыторыі, румяная, бадзёрая, узнёслая.

Мне добра знаёмы такія моманты, моманты задавальнення і асалоды, калі ўсё на свеце здаецца мілым і чароўным.

Я пакідаю філфак у сярэдзіне працоўнага дня. Экзамены працягваюцца. Значыць, наперадзе яшчэ многа хвалюючых і шчаслівых хвілін.

А ўсё ж цудоўна, што ёсць у краіне ведаў залікі і экзамены, у час якіх студэнт можа праверыць, на што ён здольны.

**Т. СКАБЕЛЬСКАЯ.**

Практыка

# СЕЯЦЬ ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ

І вось ён надыходзіць, той момант, калі ты — ужо не студэнт, але яшчэ не настаўнік — павінен адчыніць дзверы класа. І на цябе паглядзяць дваццаць-трыццаць пар вачэй...

Усё залежыць ад цябе — як гэтыя вочы будуць глядзець на свет сёння ўвечары, пасля першага твайго праведзенага ўрока, як яны будуць глядзець на свет заўтра, паслязаўтра, праз месяц, паўгода...

Анфіса Казаровец заканчвае філалагічны факультэт БДУ, хутка стане выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры.

Калі вучылася яшчэ ў школе, яна напісала ў сачыненні: «Цудоўны свет беларускай мовы і літаратуры адкрыла для мяне мая настаўніца Марыя Сямёнаўна Гатоўчык. Раней мы ніколі не задумваліся над тым, што наша родная мова такая прыгожая і яе трэба шанаваць і любіць, бо на гэтай мове размаўлялі і пісалі Янка Купала, Якуб Колас...»

Мінулі гады. Вось і пераддыпломная практыка, «свой клас» у сярэдняй школе № 54 г. Мінска.

Першы самастойны ўрок... Як сустрэнуць яе дзеці? Кожны з іх — гэта новы свет, куды ўваход забаронен. А настаўніку трэба адкрыць гэты свет, каб адтуль выпраменьвалася цяпло чалавечага сэрца. Сто варыянтаў перабраць, але знайсці патрэбны.

...Нібы з-пад зямлі, перад практыканткай вырасла тоненькая фігурка Святланы.

— Анфіса Валянцінаўна, а Васька ўчора ў школьным двары зламаў бярозку. Такую прыгожую, — аглядваючыся па баках, каб ніхто не пачуў, прашаптала дзяўчынка.

— Добра, што нагадала пра дрэвы. Сёння пасля ўрокаў будзем новую алею высаджваць. Прыходзь. А Васіль у мяне яшчэ заробіць...

Учынак Васі абмяркоўвалі перад класам. Пасаромлены, ён даў абяцанне выправіць памылку. І выправіў: пасадзіў два новыя дрэўцы.

Але вось Света. І яе крок нельга адобрыць. Дрэнна, калі дзеці пачынаюць нашэптваць на вуха. У гэтым ёй здалося нешта ад даносчыка. А, можа, глупства гэта, дробязь? Не, дробязей у выхаванні няма. Не павінна быць. У час практыкі Анфіса зрабіла для сябе вывад: трэба больш увагі ўдзяляць ва універсітэце псіхалогіі падлетка, больш цікавіцца праблемамі выхавання дзяцей...

Ну, а што дапамагло ёй устанавіць трывалы кантакт з вучнямі, дабіцца ў іх павагі? Абаяльнасць? Так! Уменне захапіць прадметам? Любоў да дзяцей? Гэта, а яшчэ тое, што ва універсітэце яна прайшла вялікую школу камсамольскай творчасці, загартавалася ў вірлівасці грамадскіх спраў.

Яна глыбока ўпэўнена, што ні адзін студэнт, асабліва будучы педагог, не можа заставацца ў баку ад грамадскай работы. Вядома, часам хочацца цішыні і спакою. Але толькі не бяздзейнасці. Грамадскі клопат дапамагае набыць навыкі, патрэбныя будучаму настаўніку, уменне пераконваць, захапляць, натхняць, сеяць у юных сэрцах святло ведаў.

**А. ВЫРВІЧ.**

# ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ КАФЕДРЫ

**Веданне палітычнай эканоміі сацыялізму неабходна для кожнага маладога спецыяліста, у якой бы галіне народнай гаспадаркі ён ні працаваў пасля заканчэння ВНУ. Добра разумеюць гэта і студэнты IV курса біялагічнага факультэта, якія здаюць экзамен па палітэканоміі ў зімовую сесію. Таму значную цікавасць у іх выклікала навуковая канферэнцыя па гэтаму прадмету.**

**Падрыхтоўка да канферэнцыі праводзілася на працягу ўсяго семестра. Вялікую практычную дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзенні яе аказалі дэканат і партбюро факультэта. Тэма канферэнцыі — «Павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і якасці прадукцыі — генеральны напрамак развіцця эканомікі развітога сацыялізму».**

**Па найбольш важных, вузлавых праблемах было падрыхтавана 19 дакладаў. Найбольш цікавы з іх — даклад Л. Паповай «Шляхі павышэння эфектыўнасці грамадскай сацыялістычнай вытворчасці на сучасным этапе», Т. Шумілінай «Эканамічная роля ўкаранення поўнага гаспадарчага разліку на сацыялістычных прадпрыемствах», Т. Каралёвай «Дасканаленне кіравання грамадскай вытворчасцю як фактар павышэння яе эфектыўнасці», А. Варанецкай «Роля невытворчай сферы ў павышэнні эфектыўнасці грамадскай вытворчасці», Т. Барай «Вольны час як эканамічная катэгорыя». Гэтыя даклады былі рэкамендаваны для прадстаўлення на агульнауніверсітэцкую навуковую студэнцкую канферэнцыю, якая адбудзецца ў красавіку гэтага года.**

**Усе дакладчыкі працавалі з даволі вялікай колькасцю сучаснай навуковай літаратуры, выкарыстоўвалі матэрыялы XXV з'езда і кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, змаглі ясна і пераканаўча выкласці свае тэмы.**

**Канферэнцыя дапамагла студэнтам расшырыць свае пазнанні ў найбольш важных, асноўных пытаннях сучаснасці, з'явілася залогам паспяховай здачы экзамена і Усесаюзнага Ленінскага заліку.**

**Такія канферэнцыі з'яўляюцца добрай традыцыяй кафедры грамадскіх навук.**

**В. МАРЦІШОНАК.**

Да 70-годдзя з дня нараджэння С. П. Каралёва

# ГАЛОЎНЫ КАНСТРУКТАР

ДОЎГІ час пра яго і яго работу ведалі нямногія, і таму не многа пра яго і пісалі. Але па тым, што напісана пра яго цяпер, можна меркаваць, які гэта быў незвычайны чалавек.

Вось думка пра Галоўнага канструктара розных людзей.

**Акадэмік Мсціслаў Усеваладавіч Келдыш:**

«Адданасць справе, незвычайны талент вучонага і канструктара, гарачая вера ў свае ідэі, кіпучая энергія і выдатныя арганізатарскія здольнасці... Ён валодаў вялікім талентам і смеласцю навуковага і тэхнічнага прадбачання, і гэта садзейнічала ажыццяўленню складанейшых навукова-тэхнічных задум...»

**Марк Галай. Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык-выпрабавальнік, пісьменнік.**

«Энергічны і дальнабачны, разумны і нецярпімы, рэзкі і ўспрыймальны, запальчывы і адыходлівы. Вялікі чалавек з вялікім, складаным, супярэчлівым, нестандартным характарам, якога не змаглі дэфармаваць ніякія знешнія абставіны, што ламалі многіх іншых людзей, як трысцінкі».

Жыццё і работа Сяргея Паўлавіча, вядома ж, маюць вялікую цікавасць. Не многім людзям давялося стаяць на чале напрамку, які адкрыў эру ў жыцці, навуцы, будучыні нашай планеты. Эру касмічную.

А пачыналася яна так.

4 кастрычніка 1957 года. Узляцеўшы з Зямлі, упершыню створанае штучнае цела не ўпала, а, абляцаючы зямны шар з касмічнай скорасцю, стала першым штучным спадарожнікам Зямлі.

3 лістапада 1957 года. Упершыню ў бязмежны і таямнічы космас паднята жывая зямная істота.

12 верасня 1959 года. Ракета, якая паднялася з Байканура, са здзіўляючай дакладнасцю паслала да Месяца паўпрэда Краіны Саветаў—«Месяц-2».

4 кастрычніка 1959 года. Старт аўтаматычнай станцыі «Месяц-3». Праз трое сутак, заглянуўшы на «той», загадкавы бок Месяца, сфатаграфавала яго і перадала людзям на Зямлю гэтыя фатаграфіі.

12 красавіка 1961 года. Грамадзянін Савецкага Саюза, камуніст Юрый Аляксеевіч Гагарын на касмічным караблі «Усход» упершыню ў свеце здзейсніў касмічны палёт вакол зямнога шара.

Да гэтага ніхто і нідзе не здзяйсняў такога. Стварыў касмічныя караблі і станцыі калектыў аднадумцаў, аб'яднаных адным імкненнем, спаяных у адно выключнай валявой і эмацыянальнай зараджанасцю Галоўнага канструктара — Сяргея Паўлавіча Каралёва.

...Гэта было ў 1959 годзе, восенню, гадзін у 11 вечара. Сяргей Паўлавіч зайшоў у цэх галоўнай зборкі. Убачыўшы Галоўнага, я пайшоў яму насустрач.

— Ну, як справы, стары?

Я падрабязна далажыў аб ходзе зборкі станцыі, аб цяжкасцях, затрымках, непрыемнасцях... Словам, пра ўсё тое, што стала будзённым у чарадзе дзён і начэй. Ішла цяжкая, напружаная работа. Людзі штурмавалі космас на Зямлі — у канструктарскіх бюро, у цэхах заводаў.

— Так, цяжка ідзе гэта штучка. Трэба будзе пагаварыць з народам. Збяру я днямі сумежнікаў і нашых. Няхай адзін аднаму ў вочы паглядзяць... Ты дамоў сёння збіраешся? —нечакана задаў ён пытанне.

Я кіўнуў галавой, не вельмі ўпэўнены ў тым, што маё жаданне будзе падтрымана.

— Ну і добра. Нам жа па дарозе. Паехалі.

Праз некалькі мінут я выйшаў з цэха. Сяргей Паўлавіч ужо сядзеў на заднім сядзенні легкавой машыны. Памятаю, што незадоўга да гэтага вечара ў нас, у канструктарскім бюро, раптоўна памёр адзін таленавіты канструктар. Страта вельмі востра перажывалася ўсімі... Магчыма, гэта і навяло тады на думку аб размове з Сяргеем Паўлавічам.

Выехалі на шашу.

Я пачаў гаварыць аб тым, што за штодзённымі цяжкасцямі, за работай усе мы не вельмі разумеем, што тут, у нас, робіцца вялікая гісторыя. І яе робяць людзі. А яны не вечныя. Што ж застанецца ў памяці народнай пра тых, хто пачынаў касмічныя справы? Ці не правільней будзе знайсці таленавітага пісьменніка, «прыняць» яго да нас на работу. Няхай ён год-два «пакруціцца» ў калектыве, паназірае, а потым напіша пра людзей.

Сяргей Паўлавіч маўчаў. Вочы яго былі заплюшчаны. Здавалася, ён не слухаў мяне.

— Увогуле, ты маеш рацыю. Сапраўды, нашы людзі робяць вялікую справу. І гэта не можа быць і не будзе забыта. Пісаць трэба. Але запрашаць пісьменніка не буду. Ён будзе, я ўпэўнен, пра мяне аднаго пісаць. А я не хачу гэтага.

Яшчэ адзін памятны эпізод.

12 красавіка 1961 года. Мінулі мінуты, гадзіны падрыхтоўкі старту «Усхода», якія прамчаліся, зліліся ў нейкі адзін няспынны паток дзён, начэй, неаддзельных адно ад аднаго імгненняў. Старт! Гагарынскае «Паехалі!..» Трывожныя мінуты чакання.

— Ну і малайчына ж Юрый! — з захапленнем гаворыць Сяргей Паўлавіч. — Вось днямі падыходжу да яго — ён спакойны, вясёлы, усміхаецца. «Што ўсміхаешся?» — пытаю. «Не ведаю, Сяргей Паўлавіч, напэўна, чалавек я такі несур'ёзны!» Я падумаў: так... пабольш бы нашай Зямлі такіх «несур'ёзных»... А вось сёння раніцай, калі ён і Цітоў апраналі свае даспехі, прыехаў я да іх, пытаю Юрыя: «Як настрой?» А ён адказвае: «Выдатны, а як у вас?» Паглядзеў на мяне ўважліва і ўсміхацца перастаў. Напэўна, добры выгляд у мяне быў... і гаворыць: «Сяргей Паўлавіч, ды вы не хвалюйцеся, усё будзе добра!» Самому гадзіна да палёту, а мяне супакойвае...

Сяргей Паўлавіч змоўк і, задумаўшыся, адкінуўся на спінку крэсла. Закрыў рукамі вочы, пацёр скроні...

— А ведаеце, таварышы, гэты ж палёт адкрые новыя, небывалыя перспектывы ў навуцы. Вось паляцяць яшчэ «Усходы» — Цітоў, Нікалаеў... Добрыя хлопцы, павінен вам сказаць, а потым... потым трэба думаць аб стварэнні на арбіце пастаяннай населенай станцыі. Мне здаецца, што ў гэтай справе нам нельга быць адзінокімі. Патрэбна міжнароднае супрацоўніцтва вучоных. Асваенне космасу — гэта справа ўсіх зямлян!

Так, хутка ўжо дваццаць гадоў або толькі дваццаць гадоў з таго часу, калі яшчэ нічога касмічнага, акрамя фантастычных аповесцей і раманаў, не існавала. А сёння людзі многаму перасталі здзіўляцца. Але нельга забыць першых, тых, хто пачынаў...

Людзі будуць памятаць імя Каралёва. І з удзячнасцю ўспамінаць яго подзвіг.

**А. ІВАНОЎ.**

# Мы гаворым: «Венсерэмас!»

Чылі... Далёкая палоска лацінаамерыканскай зямлі, прыціснутая Андамі да Ціхага акіяна. Гадоў дзесяць назад яна вабіла нас, хлапчукоў шасцідзесятых, незвычайнасцю назвы, загадкавасцю прыроды і захапляючай гісторыяй яе свабодалюбівага народа.

Верасень 70-га...Акіяны і мацерыкі — не перашкоды для людзей, калі іх родніць салідарнасць у барацьбе за справу справядлівасці. І лёс далёкай ад нас краіны стаў шэсць год назад блізкім кожнаму савецкаму чалавеку.

А потым надышоў чорны верасень 73-га. Зямлю Чылі пакрыў злавесны цень фашызму. І побач з назвай гэтай краіны загучалі да болю сціскаючыя сэрца словы «хунта», «канцлагер», «смерць». У тыя дні чылійскі народ, які ўзняўся на барацьбу, стаў яшчэ бліжэйшым кожнаму сумленнаму чалавеку на планеце...

— У рэвалюцыю прыходзяць па-рознаму. Адны — з рамантычным жаданнем барацьбы з усім і ўся, другія — цвёрда вызначыўшы сваё месца ў рэвалюцыйнай справе. Так прыйшоў у рэвалюцыю мой бацька — адзін з заснавальнікаў Сацыялістычнай партыі Чылі. Я павінен працягваць яго справу...

Яго поўнае прозвішча — Гальегільас Гансалес Карлас Умберта. Жывыя гарачыя вочы, чорная, як смоль, барада, скураная куртка — ён падобны нечым на тых людзей, якія штурмавалі казармы Манкада разам з Фідэлем Кастра, ішлі ў лясы Балівіі разам з легендарным Чэ Геварай. Ён расказвае нам, другакурснікам журфака, аб сваёй краіне.

— Апошні раз я сустрэўся з таварышам Альендэ за два дні да перавароту. Дзіўна, як знаходзіў гэты чалавек час для ўсіх. Жаданымі гасцямі ў яго кабінеце былі і дзяржаўныя дзеячы, і простыя рабочыя, сяляне. Сальвадору Альендэ было цяжка ў тыя дні. Але ён і тады не страціў упэўненасці і аптымізму. Праз два дні ля прэзідэнцкага палаца «Ла Манэда» загаварылі гарматы...

Карлас быў самым маладым дэпутатам у муніцыпалітэце Сант'яга. Яму далі там імя «маладзёжны прадстаўнік». У снежні 1973 года ён павінен быў атрымаць дыплом педагога-біёлага і быў гатовы да экзаменацыйных выпрабаванняў. Але жыццё рыхтавала яму выпрабаванні ў сто разоў цяжэйшыя. Стадыён «Насьёналь»... Ён бачыў там смерць таварышаў.

Праз некалькі месяцаў Карлас ступіў на савецкую зямлю. Яму нельга было заставацца ў Чылі: маладога сацыяліста добра ведалі як сябры, так і ворагі. Сёння ён вучыцца на II курсе Мінскага мединстытута.

— З дзяцінства марыў пабываць у вашай краіне, убачыць і спазнаць жыццё савецкага народа. Яго дабрату, гасціннасць я адчуў адразу ж, як толькі падняўся па трапу савецкага самалёта на гаванскім аэрадроме. Чаму выбраў прафесію ўрача? Добрыя ўрачы вельмі патрэбны ў нашай краіне. А я ўпэўнены, што ў хуткім часе вярнуся туды.



Карлас доўга адказваў на нашы пытанні. Іх было шмат. І, слухаючы нашага госця, мы быццам пераносіліся на яго далёкую радзіму.

— Сальвадор Альендэ. Луіс Карвалан. Пабла Неруда. Віктар Хара... У Чылі практычна няма чалавека, які не сустракаўся б з імі.

Праз некалькі дзён пасля нашай сустрэчы з Карласам прыйшла доўгачаканая і хвалюючая вестка: Луіс Карвалан на свабодзе!

Але яшчэ пакутуюць у турмах і лагерах Віктар Дзіас, Марыо Самарана, Хорхе Муньас, Хасэ Вайбель і тысячы іншых чылійскіх патрыётаў, таварышаў Карласа па барацьбе. Кліч чылійскіх дэмакратаў — «Венсерэмас!»

«Мы пераможам!» — гучыць сёння ва ўсім свеце, таму што барацьба за свабоду народа Чылі стала справай мільёнаў сумленных людзей на Зямлі. Нашай з вамі справай.

**С. НОВІКАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**
Фота **А. Басава.**

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

# КАВАЦЬ «ЖАЛЕЗАК РАДКІ»...

Сёння нам прыемна ўсведамляць тое, што літаратурная старонка «Беларускага універсітэта» набывае ўсё большую папулярнасць у нашых студэнтаў. Перш за ўсё аб гэтым сведчыць аб'ём пошты, які з моманту першага выхаду «Ружовага ранку» павялічыўся амаль удвая. Змясціць творы ўсіх жадаючых надрукавацца мы не мелі магчымасці, тым больш, што, на жаль, даволі часта гэтыя творы не адпавядалі таму якаснаму ўзроўню, пры якім іх можна прадставіць увазе чытача. Менавіта гэта і прымусіла нас зрабіць першы агляд літаратурных твораў, дасланых у рэдакцыю.

Акрамя першакурснікаў-узлётаўцаў, з творчасцю якіх нас пазнаёміў паэт Алег Лойка ў другім выпуску «Ружовага ранку», сёння ў нас ёсць цэлы шэраг іншых аўтараў, маючых права на дэбют. Некаторыя з іх (Т. Бародзіч, А. Серабракоў) дэбютавалі яшчэ ў кастрычніку. З некалькімі ж новымі імёнамі універсітэцкі чытач пазнаёміцца ў гэтым выпуску.

У наш адрас за апошнія два-тры месяцы былі дасланы творы самых разнастайных жанраў, пачынаючы ад замалёўкі або верша і канчаючы элегіяй або апавяданнем на трыццаці старонках. Большасць аўтараў — студэнты факультэта журналістыкі. Вось **Таня Манёнак**, першакурсніца. У сваіх вершах яна шчыра і замілавана гаворыць пра каханне, пра сваю родную старонку, дзяцінства. Адчуваецца, што кожны радок пісаўся з тым захапленнем, з якім пішуцца першыя радкі. Ёсць і вобразы: «**...там ля вербаў, здаецца, знайду сарамлівае, цёплае сонца**».

Але, як гэта звычайна бывае, аўтар не ўдзяліў дастатковай увагі форме, стылістычнай афарбоўцы сваіх вершаў. І ў выніку — выпадковыя, нічым не апраўданыя паўторы адных і тых жа слоў у страфе, «нацягнутая» рыфма, не зусім вытрыманы рытм — адным словам, усё тое, чым «хварэюць» многія з пачынаючых. І лепшы лекар тут — карпатлівая, калі не тытанічная праца над кожным словам, над кожным радком.

Добрую заяўку на дэбют зрабіў другі аўтар — **Тадэвуш Чарнавус**, таксама першакурснік. Што датычыцца яго вершаў, то нельга не адзначыць таго неўтаймоўнага імкнення да вобразаў, да некаторай раскаванасці свайго паэтычнага мыслення, што найбольш выгадна адрозніввае яго творчасць. Прыемна тое, што ён прагна шукае ў вырашэнні тэм штосьці сваё, ідзе іменна да свайго самаадкрыцця. Але разам з тым нас прыводзяць да расчаравання тыя ж самыя няўважлівыя адносіны да слова, супярэчлівая пабудова выразаў пры раскрыцці вобраза, стылістычныя папрэшнасці. Напрыклад, у вершы «**Восеньскія эцюды**» Тадэвуш піша:

**Вецер кахае восень, як**
**хлопец,**
**Апошняя любіць узаемна,**
**Вецер вуснамі восень**
**ловіць —**
**Холадна, непрыемна...**

А ў першых жа радках эцюда мы маем: «**восень, як цётка, зусім старая**», а той жа вецер, «**як дзядзька, свішча**». У другім вершы — «**Звычай**» чытаем:

**Так навучаў**
**Мой дзед калісьці тату,**
**Што гэты звычай існуе**
**здаўна:**
**Перш чым пакінуць**
**Матчыную хату —**
**Глядзець на ўзлесак**
**Роднага акна.**

Усё было б добра, калі б не «**ўзлесак роднага акна**», калі б гэта стылістычная памылка зноў не паўтарылася ў другой і апошняй страфе. Больш пільна трэба было б падыходзіць да выразаў і ў наступных радках:

**Тут байцы абмывалі вайной**
**Свае цяжкія раны.**
**А цяпер стаяць над ракой**
**Велізарныя краны.**

Як відаць, маладому аўтару, які, несумненна, мае паэтычныя здольнасці, трэба яшчэ многа і па-сур'ёзнаму працаваць над вершам.

Далёка не якасныя вершы прынеслі да нас **П. Васючэнка, А. Дынікаў, П. Раманчук.** Галоўная заўвага: адсутнасць свайго, колькі-небудзь паэтычнага вобраза ва ўсіх перажываннях і думках, якія з'явіліся першым штуршком у імкненні паспрабаваць сябе ў паэзіі.

Асобна патрэбна спыніцца на творчасці **І. Радыёна**, студэнта-радыёфізіка, які прыносіць у рэдакцыю цэлыя стосы вершаў, напісаных у асноўным па прынцыпу чым больш, тым лепш. Горш за ўсё тое, што ў яго творах не відаць колькі-небудзь патрабавальных адносін да слова. Бязвобразнасць, нямэтазгоднае карыстанне рытарычнымі паўторамі радкоў, нарэшце, нязграбнае, недакладнае ўжыванне слоў — складаюць даволі несуцяшальную карціну яго творчасці. Вось адзін з характэрных яго вершаў:

**ВОСПОМИНАНИЯ**
**О ПОЭТИЧЕСКОМ ПОБЕГЕ**

**Эх, родимая старушка,**
**Поняла лишь ты меня,**
**Как слезу смахнула ручка,**
**Как ушел, душой звеня!**
**Все ты, друг мой, испытала —**
**И веселье и года.**
**Над тобой не раз летала**
**Черной тучею беда.**
**Никакие испытанья**
**Не разрушат доброты.**
**В час последний расставанья**
**Сколько теплой простоты!**
**Счастье, друг мой, ты ведь**
**знаешь,**
**Только знаешь ты и то,**
**Что его все ж утеряешь,**
**Словно... зимнее пальто.**
**Что в работе лишь согреться;**
**Забедуешь — пропадешь.**
**И ответ на «Где подеться?»**
**Лишь в заботах ты найдешь.**

У такой жа манеры напісаны і «**Железнодорожная симфония**», «**Боль девушки**», «**Аисты Оли**», «**Снежинки падают, падают...**».

Часам дрэннае веданне значэнняў слоў прыводзіць аўтара да такіх выразаў: «**Люби, друг, девушку в себе**» («**Письмо к другу**»). Аб творчай несамастойнасці аўтара яскрава сведчаць такія радкі з яго вершаў, як «**тишь да тишь кругом**»..., «**с чего начинаются гении...**», «**мне кажется порою, что Земля...**» і іншыя.

Што можна параіць І. Радыёну?

Напэўна, перш за ўсё таго ўсведамлення, што паэзія — гэта поле дзейнасці не толькі здольных, часцей за ўсё таленавітых, а і выключна працавітых, патрабавальных да сябе і сваёй справы асоб, якія імкнуцца сказаць у паэзіі нешта сваё, карыснае для чытача, і якія ў гэтым сваім імкненні не спыняюцца ні перад якімі цяжкасцямі і перашкодамі.

**Поэзия, та же добыча**
**радия:**
**В грамм добыча —**
**в год труды.**
**Изводишь**
**единого слова ради**
**Тысячи тонн**
**словесной руды,—**

успамінаем мы «жалезак радкі» У. Маякоўскага. Вось прыклад таго, як патрэбна каваць кожнае слова, кожны радок верша, вось што трэба мець на ўвазе кожнаму з пачынаючых.

Спадзяёмся, што нашы аўтары, з улікам выказаных заўваг, будуць дасылаць нам свае творы не толькі ў большай колькасці, але якасныя, арыгінальныя.

**В. РОШЧЫН,**
**А. ПРАНІШНІКАЎ.**

# У НАС У ГАСЦЯХ СЛУХАЧЫ ПАДРЫХТОЎЧАГА

## ДЭБЮТ



**В. БАРЫСЕВІЧ**

### СУСТРЭЧА

Ніхто, ніхто не знае
Пра нашае спатканне.
Мо толькі каля гаю
Дарожка на змярканні.
Мо толькі зімні вечар
Ды снег, як неба, чысты,
І клён пад шляхам млечным,
Што стрэў нас урачыста.

**В. ЧУЧМАН**

### ЗІМНІ ВЕЧАР

Вецер шурпаты
Зграбае ў кучы,
Як дворнік лапатай,
Цукар сыпучы.
Белы, нямаркі,
Ён валіць і валіць
На плошчы, на паркі —
А мо хто пахваліць?..
Вусны раскрыты,
Позірк — здзіўленне...
Глытаю — не сыты...
Спыніся, імгненне!

**А. ВЯЛІКАНОСАЎ**

### СНЕЖНАЯ БАБА

Во дворе без передышки
С гомоном и звонким смехом
Лепят «зиму» ребятишки
Из подтаявшего снега.
Там подтешут, там подточат,
Там повесят украшенье,
С ними и зима хохочет
Над своим изображеньем.

* * *

Сугробы до самых карнизов
Метель намела без труда.
Стал пруд, как большой
телевизор,
С экраном из толстого льда.
И звёзды, далёкие звёзды,
Внимают всю ночь напролёт
Сквозь космоса чуткие вёрсты,
Как вьюга с эстрады поёт.

# «НАША БІЯГРАФІЯ»

Пад такой назвай «Масфільм» выпусціў новую тэлевізійную эпапею, прысвечаную 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У фільме — біяграфія краіны, наша з вамі біяграфія. Цяжкая, складаная, але шчаслівая, поўная перамог і дасягненняў. Кожны фільм серыі расказвае пра падзеі аднаго года, года гераічнай працы, энтузіязму савецкага народа.

Над кінастужкамі працавалі вядомыя кінематаграфісты і журналісты (Валянцін Сяргееў, Міхаіл Літоўчын і іншыя), ветэраны партыі, рэвалюцыі, вучоныя-гісторыкі, работнікі розных архіваў і ...тэлегледачы. Так, так, тэлегледачы. Яны даслалі і дасылаюць каштоўныя фотаздымкі, дзённікавыя запісы, пісьмы, дакументы.

Надзвычай складанымі былі пошукі ўдзельнікаў тых падзей, аб якіх расказвае фільм, але яны былі знойдзены, і глядач убачыць іх у кадры. Таксама, як убачыць і дарагога ўсім чалавека — правадыра сусветнага пралетарыяту У. І. Леніна.

Шматсерыйны фільм адрасаван усім, але болей за ўсё — маладому пакаленню, якому належыць будучыня. Гэту будучыню немагчыма будаваць, не ведаючы мінулага. Старэйшае пакаленне, як эстафету, перадае юным свае заваяванні і свае традыцыі, каб тыя працягвалі іх — будавалі камунізм, ажыццяўляючы светлыя мары чалавецтва.

**Л. АНЦІПАВА.**

СПОРТ ✦ СПОРТ ✦ СПОРТ ✦ СПОРТ

# АПЛАДЫСМЕНТЫ ЗА...ПАРАЖЭННЕ

Да канца паядынку заставалася некалькі секунд. Выбіраць не было чаго: ён прайграваў па балах, і выратаваць становішча магла толькі чыстая перамога. Але сіл ужо не было. Рукі наліліся свінцовай стомай, салёны пот засцілаў вочы.

Насупраць, быццам у тумане, ён паспеў яшчэ заўважыць сваіх сяброў.

«Яны вераць у мяне, — пранеслася думка, — яны чакаюць маёй перамогі».

«Ну, Міша, давай!» — асмяглымі губамі прашаптаў ён сам сабе і раптам звярнуў увагу на акрываўленую руку саперніка.

Свістка не было: суддзя не бачыў, што ў аднаго з байцоў зляцела павязка з пашкоджанай рукі.

Гэта быў апошні шанс. Можна было скарыстаць выпадак і правесці рашаючы прыём. Але ён устаў ва ўвесь рост, дакорліва зірнуў на суддзю і зрабіў крок да саперніка. Потым асцярожна ўзяў яго руку і стаў перавязваць бінтом.

У зале на імгненне застыла цішыня. І раптам грымнулі апладысменты.

Спорт любіць мэтанакіраваных і таленавітых, настойлівых і адданых. А яшчэ спорт любіць сумленных. Асабліва такі спорт, як барацьба.

...Калі праходзіў чэмпіянат універсітэта па вольнай барацьбе, ніхто не звярнуў увагі на шыракаплечага, каржакаватага юнака, першакурсніка з факультэта журналістыкі. Яго сапернікі вадзілі пальцамі па спісу, шукаючы імёны чэмпіёнаў, і нават на імгненне не спынялі позірк на прозвішчы Халімончыкава. Усё было ясна — навічок.

Пачаліся схваткі. У першым жа паядынку дэбютант атрымаў чыстую перамогу за 25 секунд!

Другі этап, і зноў тое ж самае: чыстая перамога. Пасля гэтага Міша ўсё часцей стаў лавіць на сабе ўважлівыя, нават насцярожаныя позіркі сапернікаў... А калі дзёрзкі навічок атрымаў яшчэ дзве перамогі запар, трэнер універсітэцкай зборнай па вольнай барацьбе падняўся з-за судзейскага століка і падышоў да спартсмена:

— Заўтра чакаю цябе на трэніроўцы.

А потым быў той паядынак у паўфінале, які Міша прайграў і які прынёс яму неафіцыйнае званне Спартсмена з вялікай літары.

Я хацеў расказаць пра некалькі імгненняў Міхаіла Халімончыка ў спорце. А можа і ў жыцці...

**А. УСЕНЯ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# ЗМЕНА ЧЭМПІЁНА

**ЗАВЯРШЫЛАСЯ ПЕРШЫНСТВО УНІВЕРСІТЭТА ПА РАДЫЁСПОРТУ. БАРАЦЬБА ЗА ПЕРШАЕ МЕСЦА НА ГЭТЫХ СПАБОРНІЦТВАХ БЫЛА ВЕЛЬМІ НАПРУЖАНАЙ.**

Да самага канца разрыў паміж камандамі быў невялікі. І толькі будучыя журналісты — мінулагоднія чэмпіёны — вырваліся далёка ўперад. Аднак адсутнасць рэзерву, за які, у адпаведнасці з умовамі першынства, таксама налічваюцца ачкі, адкінула каманду журфака на пятае месца. Лаўры ж чэмпіёнаў дасталіся зборнай гістфака.

У асабістым заліку высокія вынікі паказалі Н. Нецэса і А. Дзенісенка (гістфак), А. Уліцёнак (журфак), В. Мельнічук (фізфак), В. Барэнкаў (мехмат). Яны і складуць касцяк зборнай універсітэта, якая выступіць на гарадскіх спаборніцтвах.

**А. ЛЕАНІДАЎ.**





Зімнія эцюды. Фота **Т. САХАШЧЫК.**

**В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.

Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 01017 Заказ № 48.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.